# На Беларусь глядзяць усходнія суседзі

***Напрыканцы чэрвеня ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, што ў Палацы Рэспублікі, адкрылася выстаўка «Беларусь вачыма рускіх мастакоў». Яна ладзілася па выніках пленэру расійскіх мастакоў, якія цягам некалькіх тыдняў працавалі ў Полацку, Нясвіжы, Міры, Оршы, Талачыне, Мінску і адлюстравалі на сваіх карцінах прыгажосць беларускай зямлі, хараство прыроды і нашыя гістарычныя каштоўнасці.***



Праект быў арганізаваны пры ўдзеле Беларускага грамадска-культурнага таварыства Санкт-Пецярбурга і пры падтрымцы фонду «Созидающий мир» расійскага мецэната, доктара эканамічных навук, прафесара Вячаслава Заранкова. Сам Вячаслаў Адамавіч нарадзіўся ў Беларусі, у сямнаццаць гадоў разам з бацькамі быў вымушаны з'ехаць у Санкт-Пецярбург, але не забывае пра сваю радзіму, з'яўляецца ініцыятарам шматлікіх культурных праграмаў. Менавіта дзякуючы яму і іншым беларусам Санкт-Пецярбурга, а таксама пры падтрымцы Белтэлерадыёкампаніі ды галерэі «Універсітэт культуры» і была арганізаваная гэтая выстаўка.

У мастацкай галерэі прадстаўленыя працы жывапісцаў Яўгена Анціпава, Арсена Багдасарана, Наталлі Бекетавай, Ксеніі Заварзавай, Паўла Пічугіна, Алы Прозаравай, Івана Тарасюка і іншых. На адкрыццё выстаўкі прыехалі прадстаўнікі беларускай дыяспары, якія набылі шырокую вядомасць ды павагу за межамі і Беларусі, і Расіі. Сярод іх – выбітны кампазітар, дырэктар Творчага аб'яднання «Маэстра» Леанід Левашкевіч і намеснік старшыні Беларускага грамадска-культурнага таварыства Санкт-Пецярбурга Аляксандр Станкевіч. Пад час свайго візіту ў Беларусь яны прадставілі ў Мінску і Маладзечне дзве канцэртныя праграмы ў межах праекта «Культурная сталіца Расіі – культурнай сталіцы Беларусі».



*Праца Арсена Багдасарана*



*Праца Яўгена Анціпава*

Адкрыццё выстаўкі стала сапраўдным святам сустрэчаў. Менавіта такія імпрэзы даюць творчым дзеячам магчымасць лепей адчуць адно аднаго, падзяліцца творчымі здабыткамі і абмяняцца ідэямі. Пад час цырымоніі адкрыцця цікавыя прапановы па развіцці і ўзмацненні міжнародных культурных сувязяў у сферы мастацтва выказалі старшыня Беларускага саюза мастакоў Рыгор Сітніца, саветнік па культуры Пасольства Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь Маргарыта Навадворская, заслужаны дзеяч культуры Беларусі Рыгор Сарока. Таксама ў імпрэзе ўдзельнічалі старшыня Белтэлерадыёкампаніі Генадзь Давыдзька, народны артыст Беларусі Эдуард Ханок, пляменнік Казіміра Малевіча прафесар Ігар Малевіч, старшыня Беларускага фонду міру Максім Місько, першы міністр замежных спраў Рэспублікі Беларусь Пётр Краўчанка, прафесар Энгельс Дарашэвіч, дырэктар выдавецтва «Чатыры чвэрці» Ліліяна Анцух, прафесар Аляксандр Смолік, старшыня Міжнароднага грамадскага аб'яднання мастакоў і мастацтвазнаўцаў «Майстар» Сяргей Крыштаповіч і іншыя.

Плануецца, што выстаўка «Беларусь вачыма рускіх мастакоў» будзе прадстаўленая ў самай буйной выставачнай зале Санкт-Пецярбурга «Манеж» (яна хутка адкрыецца пасля рэканструкцыі). Хочацца спадзявацца, што працягам творчых сувязяў, усталяваных пад час выстаўкі ў Мінску, стануць цікавыя ініцыятывы, здольныя згуртаваць творчых асобаў Беларусі і Расіі ды стварыць ўмовы для збліжэння беларусаў, у якой бы краіне яны ні жылі і ні тварылі.

*Павел САПОЦЬКА,*
*дырэктар мастацкай галерэі «Універсітэт культуры»,*
*выкладчык БДУКМ*
*Фота Наталі КУПРЭВІЧ*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ